Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна

№ 4 (552) Субота, 1 лютага 1964 г. Цана 1 кап.

Мы—за трывалыя веды, веды-перакананні

*

У. Р. Івашын,
дэкан завочнага факультэта.
В. І. Старавойтаў,
намеснік дэкана.

*

У Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна колькасць студэнтаў-завочнікаў толькі за апошнія дзесяць гадоў узрасла з 1484 да 3657, а паспяховасць у мінулым 1962/63 навучальным годзе ўзрасла, у параўнанні з папярэднім, з 74 да 86 працэнтаў.

Павышэнне паспяховасці студэнтаў-завочнікаў гэта вынік перш за ўсё узросшага ўзроўню вучэбнай работы кафедр, дэканатаў, Вучоных Саветаў, партыйна-грамадскіх арганізацый, рэктарата ўніверсітэта.

На кафедры гісторыі КПСС, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, замежнай літаратуры, фізіялогіі раслін, хрыбетных жывёл і інш., на Вучоных Саветах філалагічнага, біялагічнага і інш. факультэтаў сістэматычна ўзнімаюцца, абмяркоўваюцца пытанні паляпшэння вучэбнай работы і шэраг іншых пытанняў.

Палепшыўся састаў выкладчыкаў, якія працуюць на завочным факультэце. Большасць з іх — работнікі стацыянара, у прыватнасці, прафесары В. І. Сцяпанаў, Г. Г. Вінберг, П. Ф. Ракіцкі, І. М. Сяржанін, Л. М. Шнеерсон, В. А. Дзяменцьеў і інш., дацэнты Н. О. Цэтэрман, С. В. Калішэвіч, В. А. Захарава, В. М. Сікорскі і інш.

Больш апаратыўна і поўна задавальняе цяпер бібліятэка універсітэта запатрабаванні студэнтаў-завочнікаў на вучэбную літаратуру. Павысілася вучэбная дысцыпліна завочнікаў, пераважная іх частка якасна і ў тэрмін выконвае вучэбны план і прадугледжаныя ім вучэбныя заданні. Паменшыўся адсеў студэнтаў-завочнікаў, узрос працэнт выдатнікаў. Многія з поўнай аддачай сіл паспяхова спалучаюць вучобу з работай. Прыкладам сур'ёзных адносін да вучобы могуць служыць студэнты А. Е. Саковіч (6 курс біяфака), В. С. Саўчанка (3 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры), А. К. Казаннікаў (4 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры), Л. М. Некала (5 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры), Н. В. Драбушэвіч і Н. І. Казлоўская (2 курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), Т. І. Свекла (3 курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), Н. І. Коўш, Сачкоўскі (4 курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), А. І. Косцічаў (аддзяленне філасофіі), І. Ф. Якаўлеў (4 курс аддзялення філасофіі), А. І. Панькоў, Н. Б. Ласінскі (аддзяленне гісторыі) і інш.

У мінулым навучальным годзе ў цэлым паспяхова прайшла абарона дыпломных работ і здача дзяржаўных экзаменаў. З 470 выпускнікоў 451 атрымаў дыплом аб заканчэнні ўніверсітэта. Новы атрад спецыялістаў папоўніў рады ў многіх галінах народнай гаспадаркі рэспублікі.

Нашы поспехі былі б яшчэ больш значнымі, калі б мы пераадолелі некаторыя цяжкасці і, галоўнае, калі б мы пазбеглі некаторых істотных недахопаў у рабоце.

Слабым месцам вучобы пэўнай часткі студэнтаў-завочнікаў з'яўляецца нізкая паспяховасць, невысокая якасць засваення вучэбнага матэрыялу ў выніку слабай самадысцыпліны, няўмення паспяхова спалучаць вучобу з работай. Апошняе выклікае ў некаторай часткі завочнікаў імкненне за шэсць гадоў вучобы атрымаць не веды, а дыплом, разлічваючы такім чынам прыкрыць сваё невуцтва універсітэцкім значком. Такія студэнты з году ў год, ад сесіі да сесіі, маскіруючыся ўсялякімі даведкамі, імкнуцца не перагружачваючы сябе, перабірацца з курса на курс. Здавальняючая адзнака — вось канчатковая і вышэйшая мэта для такіх студэнтаў. І дасягаецца яна нярэдка пры выніку двух-трох заходаў.

Напрыклад, Л. В. Шэршань (3 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры) мела нездавальняючую адзнаку і два незалікі за зімовую і летнюю сесіі. Яна толькі пасля чатырохразовай здачы, нарэшце, здолела атрымаць станоўчую адзнаку па курсу старажытна-славянскай мовы. Прыкладна такімі ж «поспехамі» ў вучобе вызначаюцца Т. П. Рабунец (2 курс аддзялення рускай мовы і літаратуры) — студэнтка з 1957 года, Г. Г. Бялькевіч і А. С. Войда (2 курс аддзялення журналістыкі), М. А. Смірноў (4 курс аддзялення журналістыкі), які кожную сесію заканчвае з «хвастамі», Е. Н. Леўчанка і Н. М. Князеў (3 курс аддзялення гісторыі), А. Ф. Рудзінскі (2 курс аддзялення гісторыі), В. Т. Лучакоў (6 курс аддзялення гісторыі), В. Г. Кобрын (3 курс філасофіі), Ф. Б. Феакцістаў і В. І. Барздая (2 курс аддзялення філасофіі).

Агульны культурны ўзровень пэўнай часткі завочнікаў пакідае жадаць лепшага. Аб гэтым можна меркаваць па паводзінах, мове, пісьмах, заявах і г. д., якія дэканат атрымоўвае ў свой адрас. Звычайным лічыцца сярод некаторых студэнтаў хадзіць па вучэбнаму корпусу, заходзіць у аўдыторыі і кабінеты ў паліто і шапках, курыць і кідаць акуркі дзе прыйдзецца, нават у аўдыторыях. А чаго вартыя выразы ў мове некаторых студэнтаў! Справа дайшла да таго, што ў мінулым навучальным годзе стараста адной з груп скардзіўся на студэнта філфака, які з першага курса дазваляў сабе грубасць і нетактоўнасць у адносінах з таварышамі. Гэты студэнт атрымаў спагнанне.

Або паглядзім «сачыненні» некаторых студэнтаў-завочнікаў, кожны радок якіх мае стылёвыя і нават граматычныя памылкі. Цяжка паверыць, што ў заяве на адной старонцы можна зрабіць 10—15 памылак. І піша такую заяву студэнт універсітэта і нярэдка філалагічнага факультэта!

Адным са шляхоў пазбаўлення ўніверсітэта ад такіх выпадковых студэнтаў з'явіцца кантрольныя дыктанты па рускай мове, якія ўводзяцца ў гэтым семестры, абавязковыя для студэнтаў усіх курсаў і ўсіх аддзяленняў завочнага факультэта.

Адсутнасць самадысцыпліны і адказнасці за якасць засваення вучэбнага матэрыялу растлумачваецца фармальнымі адносінамі некаторай часткі студэнтаў да выканання розных вучэбных заданняў і асабліва кантрольных пісьмовых работ.

На якія толькі хітрыкі не ідуць асобныя завочнікі ў жаданні ашукаць выкладчыка! Але яны забываюць, што ашукваюць толькі сябе, а не каго-небудзь іншага, абкрадаюць ва ўсіх адносінах. Аб гэтых студэнтах шмат ужо гаварылася і пісалася, але яны, на жаль, яшчэ ёсць.

У гэтым навучальным годзе на ўсіх аддзяленнях для прывядзення ў парадак тэрмінаў выканання пісьмовых работ уведзены графікі, якіх абавязаны прытрымлівацца ўсе студэнты. Знаходзяцца, аднак, людзі, якія не жадаюць прызнаваць ніякіх графікаў і адрасаў. Работы яны высылаюць абы куды, нават у кабінеты (як гэта зрабіла студэнтка Андросава з філфака), і абы калі. Аднак калі ім, на падставе заўвагі да вучэбнага плана, мы высылаем паведамленні, а не выклікі, тады яны пачынаюць скандаліць. Так, напрыклад, рабілі студэнты Агафонаў з аддзялення журналістыкі, Рэмязевіч і Ігнацюк з аддзялення гісторыі. Яны патрабавалі ад дэканаў, якія пакаралі іх за недысцыплінаванасць, тэрміновага растлумачэння. Але растлумачэнні не задавольвалі, і яны пачыналі абвінавачваць дэканаў у бюракратызме, бяздушшы і ў іншых зямных грэхах. Пісалі пісьмы, слалі тэлеграмы ў многія інстанцыі са скаргамі на дэканаты і метадыстаў. І не знайшлі адразу мужнасці прызнаць сваю памылку.

Праяўленнямі эгаізму, недысцыплінаванасці, разбэшчанасці характарызуюцца паводзіны значнай, на жаль, часткі завочнікаў у інтэрнатах, аўдыторыях, бібліятэках. Такія студэнты сустракаюцца на ўсіх факультэтах, асабліва на юрыдычным, геаграфічным і гістарычным. Гэта яны пераўтвараюць пакоі інтэрнатаў у свае кватэры, дзе маюць права паводзіць

(Заканчэнне на 2 стар.).

Калі вучыцца па-сапраўднаму

РЭЙД

Чарговая экзаменацыйная сесія ў завочнікаў у разгары. Як жа праходзіць яна ў біёлагаў? Як адчуваюць сябе тыя, хто трымае справаздачу за семестр?

Удзельнікі рэйдавай брыгады «Беларускага ўніверсітэта» наведалі біялагічны факультэт і папрасілі расказаць аб гэтым метадыстку Надзею Вікенцьеўну Зібо.

— Зауважаецца такая заканамернасць, — гаворыць Н. В. Зібо, — хто своечасова і якасна выконвае кантрольныя работы, той паспяхова здае і экзамены. Магу назваць у якасці прыкладу імёны студэнтаў А. Саковіча, Н. Буланава і іншых, якія з першага да апошняга курса вучацца выдатна. І поспех іх у тым, што яны карпатліва і старанна займаюцца да экзаменаў, удумліва працуюць з кнігай.

Добра паспявае пераважная большасць студэнтаў факультэта. Але ёсць і такія, што спадзяюцца на «як-небудзь». Ці не аб гэтым сведчыць прыклад са студэнтамі Лабковічам і Казмерчыкам, якія прыслалі кантрольныя работы, спісаныя ў таварышаў? Ясна, што і экзамены яны, дрэнна падрыхтаваўшыся, будуць спрабаваць здаць несумленным шляхам. Але ж вядома, да чаго гэта вядзе: фініш можа быць горкім.

Мы паглядзелі журналы рэгістрацыі і ведамасныя лісткі кантрольных работ. Здзвігі сёлета, у параўнанні з мінулым годам, ёсць. Напрыклад, значна скарацілася колькасць работ, выкананых нясвоечасова а таксама работ, вернутых студэнтам на дапрацоўку.

Ёсць на факультэце і свае цяжкасці. Адна з іх заключаецца ў тым, што спецыфіка вывучаемых дысцыплін патрабуе больш працяглага знаходжання студэнтаў ва ўніверсітэце. І перш за ўсё таму, што завочнікі павінны займацца даследніцкай работай у лабараторыях факультэта. Таму выкладчыкі стараюцца ўсё рабіць для таго, каб больш поўна выкарыстаць для лабараторных работ перыяд сесіі. Мы наведалі лабараторыю кафедры фізіялогіі бесхрыбетных жывёл і пераканаліся, што ўмовы для работы завочнікаў тут такія ж, як і ў студэнтаў стацыянара.

Лабараторыя добра абсталяваная. Многа тут і памочнікаў студэнтаў, такіх, як супрацоўніца Ольга Васільеўна Касцюк, стажоры Станіслаў Гаўрылаў, Ала Кузняцова, Іна Расошка. Тут два лабаранты і чатыры аспіранты. Завочнікам ёсць у каго спытаць, ёсць з кім параіцца. Пры жаданні, зрабіць ў лабараторыі можна многае.

Што датычыцца да ўмоў для выканання заданняў на дом, то трэба адзначыць, што значна палепшыліся і яны.

Адным словам, умовы для вучобы біёлагаў былі створаны, і многія студэнты добра выкарыстоўвалі іх. На сесію яны прыехалі падрыхтаванымі. Так мяркуюць аб сваіх ведах другакурснікі Васільеў, Селязнёў, пяцікурснікі Харчанкава, Аксяновіч. Баяцца экзаменаў і залікаў толькі тыя, хто не рыхтаваўся да іх. Што ж, кожны пажне тое, што пасеяў.

Рэйдавая брыгада «Беларускага ўніверсітэта»— група з 9 студэнтаў 3 курса завочнага аддзялення журналістыкі.

Парады старэйшых

Не бойцеся памыліцца

Студэнты 3 курса філалагічнага факультэта здалі дзяржаўны экзамен па замежнай мове. Толькі невялікая частка паказала выдатныя і добрыя веды ў межах пройдзенага матэрыялу. Многія адказвалі здавальняюча. А семнаццаць чалавек атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

У чым жа справа?

Абвінавачваюць, часам, сярэднюю школу. У нейкай ступені, гэта справядліва. Не заўсёды выкладчык аказваецца на вышыні, на вывучэнне замежнай мовы выдзяляецца мала часу — пералік аб'ектыўных і суб'ектыўных цяжкасцей можна было б прадоўжыць. Але наша мэта — мабілізацыя, а не дэмабілізацыя.

Таму мы, ведаючы, што значыць авалодаць замежнай мовай, звяртаемся да нашых студэнтаў з парадай, як трэба рабіць, каб замежная мова была не прадметам, ад якога хочацца пазбавіцца, а сродкам зносін.

Вы, таварышы, пэўна, чыталі артыкулы аб тым, як авалодаць мовай самастойна і ў кароткі тэрмін. Артыкулы гэтыя ўсхвалёўваюць, а потым, на жаль, забываюцца. Іх асноўныя палажэнні зводзяцца да простай формулы: «Пажадаць, паставіць мэту і штодзённа працаваць». А мы дапаможам вам рацыянальна арганізаваць работу. Як нам хацелася б, каб заняткі мелі не кантралюючы, а кансультуючы характар, каб мы не прымушалі, а падказвалі, папраўлялі, адказвалі на пытанні!

У нашых умовах самастойную работу можна арганізаваць такім чынам: спецыяльную літаратуру кожны чытае сам; на бытавую тэматыку і па газетных пытаннях трэба весці гутарку з партнёрам, і не бойцеся тут памыліцца; у аўдыторыі райцеся аб тым, з чым самі не справіліся самі і што хацелі б лепш ведаць.

Так, пры строгай самадысцыпліне і добрай арганізацыі самастойнай работы замежная мова можа стаць сродкам абмежаваных і нават свабодных зносін.

Загадчыкі кафедр замежных моваў
Т. Ф. КАВАНАВА,
Н. М. ПОЛАЗАЎ,
Б. П. БАРКОЎСКІ.

Вядома, у аспірантаў няма заліковых кніжак. У аспіранта ж кафедры палітычнай эканоміі Мікалая Базылева яна маецца — заліковая кніжка студэнта-завочніка інстытута замежных моваў. Гэтымі днямі ён паспяхова здаў чарговую сесію.

(Пачатак на 1 стар.).

Мы—за трывалыя веды, веды-перакананні

сябе як хочуць, аўдыторыі — у свае асабістыя кабінеты, кнігі і падручнікі, праўдамі і няпраўдамі ўзятыя ў бібліятэках, — у сваю асабістую літаратуру, якой яны як хочуць і колькі хочуць карыстаюцца. На працягу году і больш карыстаюцца падручнікамі з універсітэцкай бібліятэкі студэнты Козел (матфак), Верамейчык (геафак), Сідараў (гістфак), Карабко, Міранович (гістфак) і іншыя. Іх зусім не турбуе хваляванне таварышаў па курсу, якія з-за іх не могуць атрымаць неабходную літаратуру. Такія факты паводзін нашых студэнтаў не сумяшчальныя з правіламі сацыялістычнага супольнага жыцця.

Парушэнне вучэбнай дысцыпліны завочнікамі растлумачваецца, у асобных выпадках, недысцыплінаванасцю саміх выкладчыкаў. Нягледзячы на неаднаразовыя ўказанні рэктарата і дэканатаў аб неабходнасці павышэння якасці і своечасовага рэцэнзіравання кантрольных работ завочнікаў асобныя выкладчыкі з гэтымі ўказаннямі не лічацца. Карыстаючыся бескантрольнасцю з боку загадчыкаў кафедр, яны безадказна, фармальна ставяцца да такога важнага віду вучэбнай работы, як рэцэнзіраванне пісьмовых работ. Многія з выкладчыкаў не ўлічваюць таго, што рэцэнзіраванне ў сістэме завочнага навучання павінна з'яўляцца адной з асноўных форм кіраўніцтва самастойнай работай завочнікаў і сродкам кантролю над выкананнем імі вучэбнага плану. Значыць, выкананне пісьмовых работ не заўсёды і не ўсюды можна замяніць, напрыклад, залікам, як гэта робяць некаторыя кафедры, рэцэнзіраванне не зводзіцца да праверкі пісьмовай работы, як гэта мае месца ў школе.

Між тым, рэцэнзіі некаторых выкладчыкаў (Стэбуля, Кацібнікава, Апацёнак, Зубава і інш.) не адпавядаюць патрабаванням, бо па сутнасці з'яўляюцца больш фармальнай адпіскай, чым рэцэнзіяй. Такія рэцэнзіі не вучаць студэнтаў. Яны толькі канстатуюць або дадатныя моманты, або памылкі, якія дапушчаны студэнтам. Не даецца аналіз памылак, не ўказваюцца шляхі іх ліквідавання, каранеў, яны не з'яўляюцца пісьмовай кансультацыяй для завочніка.

Аб несур'езных адносінах некаторых выкладчыкаў да пісьмовых работ завочнікаў сведчаць стылёвыя і нават граматычныя памылкі ў іх рэцэнзіях.

Не вытрымліваюцца і тэрміны рэцэнзіравання кантрольных работ. Ці можа быць добрая тая рэцэнзія, што паслана праз 2—3 тыдні, замест 3—4 дзён, калі тэрмін выканання работы ўжо скончыўся і студэнт не мае магчымасці зрабіць работу ў другі раз пры неабходнасці?

Рэкорды безадказнасці ў гэтых адносінах устанаўлівае выкладчык кафедры беларускай мовы М. І. Сыракваш. Яго вучэбная нагрузка выконваецца ім у асноўным на завочным аддзяленні праверкай пісьмовых работ. Канешне, такое размеркаванне вучэбнай нагрузкі на кафедры беларускай мовы не можа быць апраўданым. Да таго ж сам М. І. Сыракваш месяцамі не цікавіцца паступленнем пісьмовых работ і як правіла бярэ іх пасля неаднаразовых напамінаў. Так было і ў гэтым навучальным годзе. У пачатку снежня тав. Сыракваш узяў сорак работ, якія ўжо з тыдзень праляжалі ў дэканаце, бо знайсці выкладчыка і ўручыць яму работы не прадстаўлялася магчымым. Праверка гэтых работ працягвалася больш месяца і, калі б не званкі і пісьмы дэканата ў адрас тав. Сыракваш, то, пэўна, не была б закончана да летняй сесіі.

Асобныя студэнты, усклапочаныя такой доўгай праверкай, высылалі паўторныя работы, пісалі законныя скаргі ў дэканат. Усіх гэта турбавала, толькі не тав. Сыракваш. Такі ж алімпійскі спакой у адносінах да рэцэнзіравання работ, у прыватнасці, у тт. Пётуха, Ганчаровай і некаторых іншых.

У цэлым, асобныя кафедры успамінаюць аб існаванні завочнікаў толькі пасля паступлення адпаведных загадаў рэктара. Так, на некаторых кафедрах толькі перад самым пачаткам зімовай сесіі былі размеркаваны даручэнні аб чытанні лекцый і правядзенні семінарскіх заняткаў з завочнікамі. Такая практыка работы кафедр прыводзіць да невысокай якасці вучэбнай работы асобных выкладчыкаў на завочным факультэце.

Усё яшчэ нізкі ідэйны ўзровень лекцый для завочнікаў, асабліва па цыклу прыродазнаўчых дысцыплін. Выкладчыкі гэтых прадметаў лічаць, што ідэйнае ўзбройванне студэнтаў — справа толькі выкладчыкаў грамадскіх навук.

Адсюль веды студэнтаў па прыродазнаўчых навуках носяць, часам, несістэматызаваны характар, яны не могуць таму сфарміраваць цвёрдыя ідэйныя перакананні, якія, як паветра, неабходныя спецыялістам любой галіны ведаў. Самі па сабе гэтыя перакананні важныя таму, што ў савецкага чалавека павінны быць не толькі веды спецыяліста, але і сэрца патрыёта грамадзяніна краіны Саветаў.

Нам у гэтых адносінах не варта забываць аб неабходнасці фарміраваць у працэсе навучання стройны навуковы светапогляд. Практычна гэта азначае, па Леніну, дамагацца, каб вывады камунізма абапіраліся на веданне асноў навук, сталі ўласнымі вывадамі, непазбежнымі з пункту гледжання сучаснай адукацыі. Веды не павінны быць для студэнта чужымі думкамі, яны павінны пераплаўляцца ў свае ўласныя перакананні і вывады.

«Чалавеку камуністычнага грамадства, — як справядліва заўважыў у гэтай сувязі тав. Л. Ф. Ільічоў у дакладзе на чэрвеньскім Пленуме ЦК КПСС, — патрэбна не проста сума фактаў і правіл, а глыбокія веды, веды—перакананні, асветленыя вялікімі ідэямі камунізма».

Вялікую ролю ў фарміраванні камуністычнага светапогляду павінна адыграць новая дысцыпліна, якая ўведзена ў гэтым навучальным годзе ў вышэйшых навучальных установах краіны, — курс асноў навуковага камунізма. Ён прызваны стаць адным з важнейшых сродкаў ідэйнага выхавання моладзі фарміравання чалавека новага грамадства. Тым большую ўвагу павінны ўдзяліць яму завочнікі, якія самі ў большасці выхоўваюць савецкую моладзь.

Інтарэсы будаўніцтва камуністычнага грамадства патрабуюць рашучага паляпшэння на сучасным этапе ўсёй нашай вучэбна-выхаваўчай работы. І мы абавязаны гэта зрабіць з дапамогай рэктарата і партыйных органаў.

Незабыўнае

І вось мінула шэсць гадоў упартай вучобы, настойлівай і напружанай працы, поўнай велічнага захаплення, вялікай радасці і шчасця. Мы, журналісты, прыйшлі ва ўніверсітэт з газетнага фронту. Многія з нас прайшлі дагэтуль немалую школу жыцця, набылі нямала ведаў, авалодалі нялёгкай справай пяра, некаторыя ж зрабілі ў журналістыцы толькі першыя крокі.

Здавалася, што ж больш трэба? Працуй і годзе! Але, пераступіўшы парог універсітэта, мы пазнаёміліся з многімі новымі для нас пытаннямі, справамі, якіх дагэтуль не ведалі. Глыбокія змястоўныя лекцыі нашых выкладчыкаў сустрэчы з вопытнымі журналістамі рэспублікі, газетная практыка, якая праводзілася з завочнікамі як ва ўніверсітэце, так і ў рэспубліканскіх газетах, ажыўленыя дыспуты, гарачыя абмеркаванні напісаных завочнікамі матэрыялаў на практычных занятках — усё гэта яшчэ больш паглыбіла веды, памножыла навыкі журналісцкага майстэрства.

Характэрна, што людзі, якія сёлета пакідаюць аўдыторыі ўніверсітэта, — гэта, у асноўным, здольныя журналісты. Рэспубліканскаму чытачу добра вядомы імёны журналістаў-завочнікаў Васіля Праскурава, Івана Панчанкі, Мікалая Грыцана, Дзмітрыя Калбасава, Уладзіміра Касько і многіх іншых, хто часта выступае з цікавымі, па-мастацку напісанымі нарысамі, хвалюючымі карэспандэнцыямі жывымі замалёўкамі, рэпартажамі. Яны добра ўсведамляюць тыя ганаровыя задачы, якія пастаўлены ЦК КПСС у прывітанні Першаму з'езду журналістаў: у нашай краіне друк з'яўляецца неад'емнай часткай духоўнага жыцця народа, а журналістыка — важнейшай галіной партыйнай і грамадскай дзейнасці.

Шэсць мінулых гадоў. Гэты час назаўсёды застанецца ў памяці выпускнікоў. Толькі з шчырай удзячнасцю студэнты адгукаюцца аб сваіх выкладчыках А. І. Апелінскай, Е. Л. Бондаравай, Р. В. Булацкім, В. І. Дубовіку, М. С. Зярніцкім, Б. П. Міцкевічу, Н. А. Сніцаравай, М. Я. Цікоцкім, Д. Я. Фактаровічу і іншых.

Вельмі многае робіць кафедра журналістыкі, каб будучыя работнікі друку атрымалі грунтоўныя, трывалыя тэарэтычныя веды. Аднак, на маю думку, у сучасных умовах гэтага недастаткова. Трэба, каб журналісты, якія заканчваюць універсітэт, не толькі ўмелі пісаць газетныя матэрыялы, але і практычна валодалі стэнаграфіяй, машынапісам, фотасправай. Сярод завочнікаў ёсць многа таварышаў, што працуюць на радыё. Неабходна, каб на кафедры падумалі і аб гэтай галіне журналістыкі. Журналістаў трэба вучыць рабіць запісы на магнітафоне, манціраваць плёнкі, арганізоўваць рэпартажы.

Крытэрыям вучобы з'яўляецца практыка. На маю думку, трэба ў час сесіі або ў прамежках паміж імі, каб студэнты працавалі ў рэдакцыях, каб работнікі газет і часопісаў сумесна з практыкантамі выязджалі ў камандзіроўкі, дапамагалі ім арганізоўваць матэрыялы, вучылі, як неабходна на месцах праводзіць масавую работу з рабселькорамі.

Трэба часцей арганізоўваць выпуск вучэбнай газеты «Журналіст» сіламі завочнікаў непасрэдна ў калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах. Пажадана практыкаваць, каб завочнікі выконвалі ў «Журналісце» абавязкі рэдактара, сакратара, загадчыка аддзела.

Неабходна больш глыбока вывучаць эканоміку народнай гаспадаркі, вучыцца самастойна рабіць эканамічны аналіз гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства, калгаса, саўгаса, глыбока разбірацца ва ўнутрыгаспадарчым разліку і іншых пытаннях, яшчэ больш наблізіць навучанне да практыкі жыцця, да практыкі камуністычнага будаўніцтва.

М. БЕЛЬСКІ,
член Саюза журналістаў СССР, студэнт-завочнік 6 курса аддз. журналістыкі.

Перапіска дружбы

Клуб інтэрнацыянальнай дружбы БДУ імя У. І. Леніна і Клуб міжнароднай дружбы Познаньскага ўніверсітэта імя А. Міцкевіча. Паміж гэтымі маладзёжнымі арганізацыямі пачалася цяпер сяброўская перапіска аб жыцці, вучобе, добрых справах студэнтаў абедзвюх вышэйшых навучальных устаноў. На адрас Клуба інтэрнацыянальнай дружбы, а таксама асобным членам КІДа прыходзяць шмат пісьмаў ад замежных сяброў, ад клубаў дружбы іншых вну краіны. На здымку вы бачыце членаў КІДа за чытаннем сяброўскай пошты.

Вяртаючыся да надрукаванага

„КАЛІ ПОБАЧ СЯБРЫ“

Вы помніце, дарагія чытачы, пад такім загалоўкам у нумары нашай газеты ад 31 снежня мінулага года быў надрукаваны матэрыял аб студэнтцы-завочніцы 1 курса юрыдычнага факультэта Розе Васільчык, якая знаходзілася на лячэнні ў адной з мінскіх клінік. Выказвалася там прапанова аб тым, каб факультэт дапамог Розе падрыхтавацца да зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Гэтымі днямі карэспандэнт газеты «Беларускі ўніверсітэт» гутарыў з дэканам факультэта В. А. Дарогіным аб тым, што было зроблена за той час, што прайшоў пасля апублікавання матэрыялу.

Вось што расказаў Васіль Аляксандравіч Дарогін. У клініку да Розы Васільчык двойчы прыходзіла кандыдат гістарычных навук Валянціна Васільеўна Сарокіна. Яна давала дзяўчыне кансультацыі па незразумелых пытаннях, забяспечыла неабходнай літаратурай. Наведвала Розу і сакратар завочнага факультэта Марыя Бачыла.. Яна пазнаёміла дзяўчыну з вучэбным планам, дала спісы неабходнай літаратуры.

На гэтым візіты ў клініку скончыліся, бо неўзабаве Розу выпісалі з бальніцы, і мы павіншавалі яе з выздараўленнем. Але факультэт і тут патурбаваўся аб студэнтцы: ёй дадзена магчымасць здаваць экзамены не ў перыяд сесіі, а па меры падрыхтоўкі да іх, яна атрымлівае кваліфікаваныя кансультацыі ў нашых выкладчыкаў. І мы ўпэўнены, што Роза Васільчык паспяхова здасць экзамены.

Жадаем ёй поспехаў!

Падручнік жыцця

У мінулую суботу студэнты пятага курса вячэрняга аддзялення журналістыкі здавалі экзамен па рускай савецкай літаратуры. Гэта было своеасаблівым выпрабаваннем на сталасць людзей, якія вырашылі прысвяціць жыццё высакароднай і нялёгкай працы журналіста. І трэба сказаць, што большасць з іх паказала добрыя і трывалыя веды.

Адказвае студэнт Б. Рэзнік. Упэўнена і дакладна асвятляе ён пытанні білета, добра разбіраецца ў дадатковых пытаннях. У яго залікоўцы з'яўляецца заслужанае «выдатна». А. Пацэвіч расказвае аб савецкім гістарычным рамане. І перад слухачамі праходзяць Іван Грозны і Пётр Першы, Балотнікаў і Разін. Дацэнт Н. М. Рамашка задаволена.

Некаторыя студэнты паказалі дрэнныя веды па тэорыі літаратуры, бездапаможнасць пры адказе на пытанні, якія патрабуюць параўнаўчай характарыстыкі або шырокіх абагульненняў. На выніках экзамену адбілася і дрэннае наведванне лекцыйных заняткаў. Экзаменатару ўдалося пазнаёміцца з некаторымі студэнтамі толькі ў час экзамену. Прапусціўшы шмат лекцый і не прачытаўшы твораў па праграме, некаторыя вячэрнікі апынуліся на экзамене ў вельмі цяжкім становішчы.

У студэнтаў вячэрняга аддзялення наперадзе яшчэ год напружанай вучобы, і, пакуль не позна, асобныя з іх павінны карэнным чынам змяніць свае адносіны да савецкай літаратуры — нашага падручніка жыцця.

І. ЖАМЧУЖНЫ.

І Беларуская матэматычная канферэнцыя

З 25 па 28 студзеня ў галоўным корпусе ўніверсітэта праходзіла Першая Беларуская матэматычная канферэнцыя. У яе рабоце ўдзельнічалі вучоныя вышэйшых навучальных устаноў, навуковых устаноў, выкладчыкі матэматыкі ў школах рэспублікі, госці з Масквы, Ленінграда, Кіева, Свярдлоўска, Растова-на-Доне і іншых гарадоў краіны.

На плянарным пасяджэнні 25 студзеня з прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся Міністр вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі БССР прафесар М. В. Дарашэвіч.

Работа канферэнцыі праходзіла ў шасці секцыях.

МІНСК—БАКУ

28 студзеня ў спартыўнай зале БДУ адбылася таварысцкая сустрэча гандбалістаў БДУ і Бакінскага медыцынскага інстытута. Абедзве гульні выйгралі нашы спартсмены: жанчыны — з лікам 13:3 (6:1), а мужчыны—з лікам 18:12 (6:5).

С. ЗУБОВІЧ,
студэнт І курса вячэрняга аддз. геафака.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Хто любіць мастацкую літаратуру, прабуе ў ёй свае сілы, піша апавяданні, нарысы, вершы — уступайце ў літаратурнае аб'яднанне пры рэдакцыі газеты «Мінская праўда». У літаб'яднанні будуць абмяркоўвацца творы пачынаючых, арганізуюцца лекцыі па пытаннях майстэрства, сустрэчы з пісьменнікамі. Лепшыя творы, рэкамендаваныя літаб'яднаннем, будуць перыядычна друкавацца ў «Мінскай праўдзе».

Запісацца ў літаб'яднанне, а таксама атрымаць неабходныя даведкі можна ў ідэалагічным аддзеле рэдакцыі (тэл. 3-16-23).

Рэдакцыя газеты «МІНСКАЯ ПРАЎДА».

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа. АТ 02055. Тыр. 2000 Зак. 559.